Раздзел
першы

# Сусветны дзень пісьменніка



Літаратура ў шырокім сэнсе аб’ядноўвае **ўсе** пісьмовыя тэксты. Часцей за ўсё пад літаратурай разумеюць мастацкую літаратуру, гэта значыць літаратуру як від мастацтва. За шматвяковую гісторыю існавання мастацкай літаратуры да асэнсавання гэтага феномену падыходзілі па-рознаму, шукаючы адказ на пытанне: што ж такое – літаратура?



Даследчыкі прызнаюць, што паняцце мастацкасці з’яўляецца цяжка вызначальным, што могуць існаваць разнастайныя крытэрыі вылучэння прыкметаў мастацкасці. Аднак катэгорыя мастацкасці мае між тым вельмі істотнае значэнне, паколькі менавіта ёю вызначаецца прыналежнасць літаратуры да мастацтва.

Важна вызначыць не толькі тыпалагічна агульныя рысы і характарыстыкі, якія збліжаюць літаратуру з іншымі відамі мастацтва, але і тое, што іх адрознівае. Параўнанне і супастаўленне даюць якраз добрую магчымасць для вызначэння на гэтым фоне спецыфікі кожнага з мастацтваў, у тым ліку і літаратуры, як надзвычай спецыфічнага віду мастацтва, матэрыялам тварэння для якога паўстае эстэтычна пераўтворанае маўленне чалавека, а выніковым аб’ектам творчага акта з’яўляецца мастацкі свет літаратурнага твора, які ўспрымаецца віртуальна.



Даследчыкі фіксуюць адчувальную змену статусу мастацкай літаратуры «ва ўмовах «інфармацыйнага грамадства», адной з найбольш уражлівых праяў якога стаў Інтэрнэт як сучасны варыянт гіпермедыя (слова, выяўленчы рад, гукавы тэкст і да т. п.). Слоўнае мастацтва, арыентаванае на высокі культурны і інтэлектуальны ўзровень, перажывае надзвычай цяжкі працэс адаптацыі да масавага спажывання высокіх узораў класікі.



Сучасныя гуманітарныя веды разглядаюць культуру як феномен, што рэпрэзентуе цэласны вобраз свету. Відавочна, што ў працэсе спасціжэння літаратуры як мастацтва слова фарміруецца не толькі мысленчая, але і эмацыйна-пачуццёвая культура асобы, «крышталізуюцца» яе каштоўнасныя рэакцыі, мэты і матывацыя дзейнасці.

Кожны сапраўдны твор мастацтва ў нечым напамінае жывы арганізм, які функцыяніруе самастойна. У ім усё падпарадкоўваецца, як і ў кожным жывым арганізме, закону адпаведнасці і ўзаемаабумоўленасці, закону гарманічнасці і прыгажосці.

Ёсць мастацкая гармонія (а гармонія ўтвараецца ад узаемадзеяння, узаемапранікнення розных якасцей, розных элементаў, часам рэзка супрацьлеглых) – ёсць стыль як адзінства адлюстравання і выражэння.


Таму толькі сапраўды магутны індывідуальны літаратурны стыль валодае той сілай і той прывабнасцю, якія дазваляюць убачыць у ім непаўторныя і прываблівыя рысы літаратурнага таленту, які яго стварыў, творчай індывідуальнасці пісьменніка, дае сапраўднае ўяўленне пра багацце, мнагаграннасць, шматграннасць, непадробную жыццёвасць мастацкай формы.
Асновай стылю, яго душою з'яўляецца мова. Гэта – кароль на шахматнай дошцы стылю. Няма караля – не можа быць ніякай ігры. Няма мовы – няма пісьменніка.

Гаворачы пра творчую манеру пісьменніка, бясспрэчна, цяжка вылучыць толькі момант асабісты, прыродны ў шырокім сэнсе слова. Хутчэй трэба мецць на ўвазе індывідуальны комплекс, індывідуальную сістэму, у якую ўваходзіць усё набытае у працэсе мастацкага развіцця чалавецтва і народу, перапрацаванае на своеасаблівай канкрэтнай чалавечай аснове.



Стыль пісьменніка, хоць і ўвесь час падкрэсліваецца яго індывідуальны характар, непарыўна звязаны з нацыянальнай духоўнай і мастацкай традыцыяй, з сучасным літаратурным працэсам.

Выкарыстаная крыніцы, з якімі можна пазнаёміцца ў <u>краязнаўчым цэнтры</u>:

«Стыль пісьменніка» (1974)

«Сямнаццатай вясной» (2012)

«Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць» (2014), Гарадніцкі Я.



# Дзякуй за ўвагу!

Выстаўку падрыхтавала супрацоўніца краязнаўчага цэнтра
ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева»
Крывецкая Ксенія
2021 г.